РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Наталля Петухова*

## РЭАЛІЗАЦЫЯ ПЕДАГАГІЧНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ФАЛЬКЛОРУ Ў ДЗЕЙНАСЦІ ДЗІЦЯЧЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

У этнапедагагічных даследаваннях апошняга дзесяцігоддзя менавіта фальклору надаецца значная роля ў вырашэнні задач працоўнага, разумовага, эстэтычнага, патрыятычнага, экалагічнага, фізічнага выхавання. Так, згодна з Г.П. Арловай, У.Ф. Валадзько, Л.М. Варанецкай, Г.М. Волкавым, А.А. Грымаць і інш. педагагічны патэнцыял фальклорнай творчасці рэалізуецца, у першую чаргу, праз успрыманне і спасціжэнне ідэйна-тэматычнага, эстэтычнага зместу мастацкіх твораў (песень, карагодаў, казак, прыказак, прымавак і інш.), дзе ў вобразанай, паэтычнай форме адлюстраваны шматлікія нормы і правілы паводзін у адпаведнасці з маральнымі патрабаваннямі і ўяўленнямі традыцыйнай сялянскай супольнасці аб прыгажосці. У помніках народнай творчасці жывуць станоўчыя героі, якія з'яўляюцца прыкладамі пераможцаў і герояў для дзяцей і моладзі, адлюстраваны тыя эстэтычныя, этычныя, маральныя ідэалы, якія высветлены і зацверджаны жыццёвымі абставінамі ў пэўным прыродным ландшафце. Фальклорныя творы, змяшчаючы ў сабе магутны пласт педагагічных ідэй, з'яўляюцца асновай фарміравання гарманічна развітой асобы ў сучасным адукацыйна-выхаваўчам працэсе.

Неабходна падкрэсліць, што на ўсіх стадыях грамадска-гістарычнага развіцця фальклор з'яўляецца неад'емнай часткай разнастайнай сацыяльна-культурнай практыкі грамадства, што гэта не проста сукупнасць мастацкіх твораў, а куды больш шырокая, складаная з'ява, якая ахоплівае ледзь не ўсе бакі быцця традыцыйнага грамадства. Таму ў традыцыйным фальклоры не існуе мастацкіх твораў, так ці інакш не звязаных з адпаведнай сітуацыяй. Гэта значыць, што педагагічны патэнцыял фальклору рэалізоўваўся не толькі шляхам успрымання і спасціжэння пэўнай інфармацыі фальклорнага твора, а ў ходзе актыўнага саўдзелу ва ўсіх сферах жыццядзейнасці вясковай супольнасці, што натуральным чынам забяспечвала працэс гадавання і выхавання дзяцей.

Цесная сувязь фальклору з жыццём у значнай ступені абумоўлівала яго педагагічную эфектыўнасць. Спевакі і выканаўцы на народных інструментах, казачнікі і народныя майстры, асаблівасці ўзаемаадносінаў паміж людзьмі і навакольным светам стваралі фальклорнае асяроддзе, у якім ажыццяўлялася трансляцыя сацыяльнага вопыту і аднаўленне ўстойлівых форм грамадскага жыцця ў культурнай прасторы. Педагагічны працэс, арганічна ўплятаючыся ва ўсе сферы чалавечых адносінаў, не вычляняўся з жыцця і ствараў умовы для пагружэння асобы ў разнастайныя віды фальклорнай дзейнасці. Як слушна падкрэслівае В.С. Болбас – «гэта адзін з істотных момантаў, які мы сёння павінны запазычыць у педагагічнага генія народа і пакласці ў падмурак тэорыі і практыкі выхавання падрастаючых пакаленняў» [1, с. 7].

Таму, згодна прац даследчыкаў А.М. Аляхновічам, Г.П. Бажэдонавай, В.С. Болбасам, Е.Г. Баронінай, М.Ц. Картаўцавай, В.М. Кузьміной, Л.Л. Ражковай, В.І. Саладухіным і інш. педагагічнае выкарыстанне фальклору патрабуе ўкаранення ў педагагічны працэс жыццёвай практыкі ўспрымання і засваення фальклору, прадстаўленага такімі характэрнымі канстытуцыйнымі прыметамі, як традыцыйнасць (народныя ўяўленні аб грамадскім жыцці, прыродзе, а таксама характэрныя спосабы іх мастацкага адлюстравання), вуснасць (спецыфіка арганізацыі і трансляцыі фальклорных твораў), сінкрэтызм (адзінства і сінтэз розных відаў мастацтва), варыятыўнасць (форма функцыянавання фальклорнага мастацтва, яго імправізацыйнае пераўтварэнне, абумоўленае арыентацыяй на традыцыйны ўзор), калектыўнасць (гуртавая прырода стварэння і выканання фальклорных твораў), унутрысітуацыйнасць (сувязь фальклорных твораў з жыццём, сітуацыяй выканання). Менавіта яны з'яўляліся падставай для фарміравання асобы ў традыцыйным грамадстве.

Адсюль вынікае, што педагагічны патэнцыял фальклору можа быць поўнавартасна рэалізаваны толькі на падставе адзінства фальклору як мастацтва і жыццёвай практыкі яго трансляцыі і пераймання. Гэта значыць, што педагагічны працэс патрабуе вуснасці пераймання, якая мабілізуе ўспрыманне, актывізуе памяць, стымулюе паглыбленае асэнсаванне духоўнага вопыту народа; традыцыйнасці, якая забяспечвае захаванне склаўшыхся традыцыйных формул, што падахвочвае выхаванцаў да суадносінаў мінулага вопыту з сучаснай практыкай; варыятыўнасці, якая забяспечвае адзінства працэсаў стварэння – выканяння – успрымання; сінкрэтызму, які адлюстроўвае мастацка-змястоўную, стылявую асаблівасці фальклору, недыферэнцыраванасць філасофіі, маралі, вераванняў і мастацкага пачатку, што садзейнічае цэласнаму фарміраванню духоўнага свету асобы і выступае ўмовай і сродкам самарэалізацыі чалавека; калектыўнасці, якая заўсёды грунтуецца на пераемнасці традыцыйнага вопыту грамадства.

Аднак, сучасная практыка далучэння дзяцей да фальклору ў фальклорных калектывах у большасці пабудавана на традыцыях пісьмовай культуры, у выніку чаго фальклор засвойваецца тым жа шляхам, што і прафесійная музыка: дамінуе канцэртная накіраванасць навучання, захапленне сцэнічна эфектным матэрыялам, гульні, песні развучваюцца па нотах і ў апрацоўках. Так, увесь працэс выхавання ў фальклорных калектывах выступае як этап творчай самарэалізацыі яго ўдзельнікаў і скіраваны, у першую чаргу, на ўдасканаленне выканальніцкага майстэрства, канчатковым вынікам якога з'яўляецца стварэнне канцэртнай праграмы, якая разлічана на выкананне з канцэртных пляцовак.

Канцэртная накіраванасць навучання вядзе да парушэння вядучага прынцыпу народнай педагогікі – прыродаадпаведнасці, які аб'ектыўна абумоўлівае засваенне і аднаўленне фальклорных твораў адпаведна традыцыйнаму календару: зімовыя песні – зімой, летнія – летам і г.д. Такая сітуацыя вядзе да неразумення спецыфікі «жывога» бытавання твораў фальклору, губляецца традыцыйны сэнс выканання, і, як вынік, – паніжэнне інтарэсу выхаванцаў да народнай культуры. Аднак сучасныя ўмовы дзейнасці фальклорных калектываў спрыяюць актыўнай канцэртнай дзейнасці, і, на наш погляд, трэба ўлічваць, што трапляючы на сцэну, народная творчасць істотна трансфармуецца і губляе пэўную частку свайго педагагічнага патэнцыялу.

Вядома, што першапачатковае натуральнае існаванне фальклору не разлічана на выкананне на сцэне, бо фальклор менш за ўсё можа разглядацца як перадача інфармацыі пасіўнаму слухачу. Значнае адрозненне выканання песні ў традыцыі – гэта «спевы для сябе», а не для другіх. Такія спевы прадугледжваюць своеасаблівую манеру выканання, у якой немагчыма выкарыстанне «канцэртных» правілаў. Згодна з вядомым даследчыкам Б.М. Пуцілавым, падчас выканання мастацкіх твораў фальклору не заўсёды патрэбна аўдыторыя, бо фальклор гэта не канцэртная з'ява і па сваёй прыродзе ён звернуты не да гледача, а ў сярэдзіну, у фальклорнае асяроддзе [2, с. 10].

Трэба дадаць, што для традыцыйнай супольнасці фальклор з'яўляецца спосабам быцця, а для ўдзельнікаў дзіцячых фальклорных калектываў – матэрыялам для стварэння канцэртнай праграмы. У выніку чаго губляецца значная частка педагагічнага патэнцыялу фальклору. Мы сцвярджаем, што «школа» традыцыі патрабуе беражлівых адносінаў і аднаўлення ў педагагічнай практыцы фальклорных калектываў. Укараненне ў педагагічны працэс жыццёвай практыкі ўспрымання і засваення фальклору дазваляе сфарміраваць адносіны выхаванцаў да фальклору як спосабу быцця, спрыяе максімальнаму спасціжэнню фальклорнай культуры і засваенню яе каштоўнасцяў.

Такім чынам, на падставе вышэйсказанага мы можам сцвярджаць, што педагагічнае выкарыстанне фальклору патрабуе: па-першае засваення педагагічных ідэй, інфармацыі, заключаных у паэтычным змесце твора, па-другое: укаранення ў педагагічны працэс жыццёвай практыкі ўспрымання і засваення фальклору, што аказвае выхаваўчае ўздзеянне на асобу дзіцяці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры**

1. Болбас, В. С. Этычная педагогіка беларусаў / В.С. Болбас. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 175 с.
2. Путилов, Б. К. Морфологии фольклорной культуры / Б.К. Путилов // Искусство устной традиции. Историческая морфология: К 60-летию И.И.Земцовского : сб. статей / отв. ред. и сост. Н.Ю. Альмеева. СПб.: Рос. ин-т истории искусств, 2002. – С. 8–11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ